Вучэбная дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» ўтрымліваецца ў дзяржаўным кампаненце ўстановы вышэйшай адукацыі цыкла агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін вучэбных планаў установы адукацыі «Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь».

Вучэбная дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» накіравана на фарміраванне наступнай універсальнай кампетэнцыі: УК-10 (УК-15, УК-17, УК-11 – у залежнасці ад спецыяльнасці): Выкарыстоўваць асноўныя паняцці і тэрміны спецыяльнай лексікі беларускай мовы ў прафесійнай дзейнасці.

Вынікі навучання:

*ведаць:* ролю мовы і маўлення ў працэсе сацыяльных зносін; функцыі беларускай мовы як асноватворнага кампанента нацыянальнай культуры; месца і ролю беларускай мовы ў сусветнай супольнасці народаў і моў; сістэму лексічных, граматычных і стылістычных сродкаў беларускай мовы; поўны набор прафесійнай лексікі; тэрміналагічныя слоўнікі і слоўнікі па адпаведных сферах навукова-прафесійнай дзейнасці;

*умець:* граматна карыстацца вуснай і пісьмовай формамі беларускай літаратурнай мовы; адэкватна ўспрымаць прафесійныя тэксты і навуковую галіновую інфармацыю; перакладаць, анатаваць і рэферыраваць прафесійна арыентаваныя тэксты; складаць і весці на беларускай мове дзелавую дакументацыю, рыхтаваць навуковыя і публіцыстычныя выступленні і г.д.;

*валодаць:* прынцыпамі фарміравання і пераказу прафесійных тэкстаў на беларускай мове; афармленнем справавой дакументацыі на беларускай мове; сістэмай ведаў пра фанетычныя, лексічныя і граматычныя асаблівасці сучаснай беларускай літаратурнай мовы; сучаснымі нормамі беларускага правапісу; вуснай і пісьмовай формамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў сферах прафесійнай і грамадскай дзейнасці.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» прадугледжана 40 акадэмічных гадзін у 2 семестры (1 семестры[1]) (34 гадзіны – аўдыторныя гадзіны). Форма бягучай атэстацыі – кантрольныя работы. Форма прамежкавай атэстацыі – залік у 2 семестры (1 семестры[2]).

Вучэбная дысцыпліна вывучае нормы беларускай літаратурнай мовы, асаблівасці навуковага і афіцыйна-справавага стыляў, культуры маўлення, а таксама тэрміналогію і прафесійную лексіку па спецыяльнасці.

---

[1] для навучэнцаў факультэта права дзённай формы атрымання вышэйшай адукацыі

[2] для навучэнцаў факультэта права дзённай формы атрымання вышэйшай адукацыі